Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2024-10-25

# прыняты ў СПБ



**Галіна Францішкаўна АНТОНАВА.** Нарадзілася ў 1977 годзе ў в. Сасноўка Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці. Скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Працуе карэспандэнтам газеты «Светлы шлях» (Смаргонь). Аўтар кніг публіцыстыкі «Дзяруга», «Самародкі», «Месца пад сонцам» і іншых.



**Аляксандр Паўлавіч КРЫВАНОС (Аляксандр Брыт).** Нарадзіўся ў 1966 годзе ў Мінску. Скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, спецыяльны факультэт замежных моў Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта. Працаваў у выдавецкай, інфармацыйнай сферах. Друкаваўся ў газеце «Літаратура і мастацтва», часопісах «Маладосць», «Нёман», калектыўных зборніках. Аўтар кнігі прозы «Кино».



**Руслан Анатольевіч ПІВАВАРАЎ.** Нарадзіўся ў 1972 годзе ў г. Новамаскоўску Днепрапятроўскай вобласці (Украіна). Атрымаў сярэднюю адукацыю. Працаваў на розных прадпрыемствах, цяпер — на Мінойтаўскім рамонтным заводзе. Аўтар кніг паэзіі «О жизнь, тебя я прославляю!», «Тропою времен», «Свой крест», казкі ў вершах «О царь-девице Наталье» і іншых.



**Мікалай Валянцінавіч ТРУС.** Нарадзіўся ў 1969 годзе ў в. Ісаевічы Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці. Скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і аспірантуру пры ім, дактарантуру Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. Працуе ў Цэнтры даследаванняў старадрукаў і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі. Аўтар манаграфій «Янка Купала ў Славакіі», «Максім Багдановіч: коды жыцця і творчасці», «Паэтыка літаратурных сувязей» і іншых.



**Таццяна Анатольеўна ХАРЫТОНАВА.** Нарадзілася ў 1961 годзе ў г. Шчучыне Гродзенскай вобласці. Скончыла Гродзенскае музычна-педагагічнае вучылішча, Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя М. Горкага. Працавала псіхолагам у розных установах. Аўтар кніг прозы «Цветы наизнанку», «Мамино наследство», «Цена одиночества», рамана-дылогіі «Княжна. Игуменья» і іншых.